Весці БДПУ. Серыя 1. 2023. № 2. С. 93–96

УДК 81’42

UDC 81’42

# ВЕРБАЛІЗАЦЫЯ АДМОЎНЫХ ІНТЭНСІЎНЫХ ЭМОЦЫЙ УНУТРАНАГА СВЕТУ ЧАЛАВЕКА Ў ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫМ ДЫСКУРСЕ*

# VERBALIZATION OF NEGATIVE INTENSIVE EMOTIONS OF HUMAN INNER WORLD IN PUBLICIST DISCOURSE

**К. І. Субота,**
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры замежных моў*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага*
*ўніверсітэта імя Максіма Танка;*

**М. Ю. Чыкіль,**
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры замежных моў*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага*
*ўніверсітэта імя Максіма Танка*

**K. Subota,**
*PhD in Philology, Associate Professor*
*of the Department of Foreign Languages,*
*Belarusian State Pedagogical University*
*named after Maxim Tank;*

**M. Chikil,**
*PhD in Philology, Associate Professor*
*of the Department of Foreign Languages,*
*Belarusian State Pedagogical University*
*named after Maxim Tank*

Паступіў у рэдакцыю 14.04.23.

Received on 14.04.23.

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці вербалізацыі ўнутранага свету чалавека ў публіцыстычным дыскурсе. На аснове праведзенага аналізу выяўлена павелічэнне частотнасці выкарыстання псіхалагічнай, сацыяльна-педагагічнай тэрміналогіі. Даследаванне носіць структурна-семантычны, а таксама функцыянальны характар. Падчас аналізу асаблівая ўвага звяртаецца на функцыі першаснай і другаснай намінацый адмоўных інтэнсіўных эмоцый.

*Ключавыя словы:* вербалізацыя *эмоцый, першасныя намінацыі, другасныя намінацыі, унутраны свет чалавека, антрапацэнтрызм*.

The article considers the features of verbalization of human inner world in publicist discourse. On the base of the conducted analysis it reveals the increase of frequency in usage of psychological, social-pedagogical terminology. The study has structural-semantic as well as functional nature. In the course of analysis, the attention is paid to the functions of primary and secondary nominations of negative intensive emotions.

*Keywords: emotions* verbalization, *primary nominations, secondary nominations, human inner world, anthropocentrism*.

У сувязі з істотнымі зменамі ў структуры і дынаміцы сучасных навуковых ведаў, а таксама ўсведамленнем значнасці антрапацэнтрычнага падыходу ў даследаваннях па канцэптуалізацыі і рэпрэзентацыі свету, цікавасць даследчыкаў да вывучэння моўных адзінак псіхічнага стану чалавека, эмацыйна-пачуццёвай сферы павялічваецца. У навуковай літаратуры існуе вялікая колькасць даследаванняў, прысвечаных пытанням вербалізацыі канцэптаў унутранага свету чалавека і эмоцый, якія адлюстроўваюць гэты свет. Семантычнае поле ўнутранага свету чалавека разглядаецца даследчыкамі ў межах структурна-семантычнага падыходу, лінгвапрагматыкі, лінгвакультуралагічнага напрамку, кагнітывістыкі і псіхалінгвістыкі. На думку аўтараў артыкула, у сучасных лінгвістычных даследаваннях выкарыстоўваецца антрапацэнтрычны падыход, увага даследчыкаў сканцэнтравана на вывучэнні моўнай асобы як асноўнага прадстаўніка моўнай карціны свету. Карціна свету, як вядома, з’яўляецца сэнсавай асновай, на якой трымаецца ўся лексіка-семантычная сістэма мовы, і ўзнікае ў працэсе ўзаемадзеяння чалавека са знешнім асяроддзем. Акрамя таго, што чалавек – істота сацыяльная, жыве ў грамадстве, ўзаемадзейнічае з іншымі індывідамі, ён таксама жыве і ў сваім унутраным свеце [1, с.75]

У апошні час у сувязі з глабалізацыйнымі працэсамі, развіццём лічбавых працэсаў і інфарматызацыяй можна назіраць устойлівую тэндэнцыю да трансфармацыі моўнай карціны свету беларусаў з наіўнай у больш навуковую [2, с. 47].

Яскрава назіраецца дадзеная тэндэнцыя ў публіцыстычных тэкстах, якія адлюстроўваюць і фарміруюць сацыяльны менталітэт, каштоўнасна-сэнсавыя арыентацыі грамадства, а таксама ў некаторай ступені мадэлююць унутраны свет чалавека. Наша даследаванне прысвечана адлюстраванню сацыяльнага ўзаемадзеяння чалавека як аднаго з аспектаў яго ўнутранага свету ў публіцыстычным дыскурсе. Матэрыялам для даследавання паслужылі тэксты артыкулаў з выданняў «Звязда» і «Настаўніцкая газета», выбар якіх абумоўлены колькасна і якасна вызначанай аўдыторыяй (работнікі сферы адукацыі). Даследаванне выконвалася метадам суцэльнай выбаркі.

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца высвятленне характару першасных і другасных намінацый, спецыфікі семантычных дэрывацый з’яў унутранага свету чалавека. Асаблівую цікавасць выклікае вывучэнне лінгвістычнага прадстаўлення адмоўных (гнеў, ярасць, злосць) інтэнсіўных эмоцый і іх вербальная рэалізацыя ў публіцыстычным тэксце, арыентаваным на работнікаў сферы адукацыі, якія забяспечваюць неабходныя ўмовы для фарміравання маральна і сацыяльна развітага будучага пакалення.

* Артыкул (распрацоўка – у актах укаранення) падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ ДР 20211211).

Агульнапрызнаным з'яўляецца факт, што сацыяльнае ўзаемадзеянне адбываецца праз зносіны, у працэсе якіх псіхічны працэс трансфармуецца ў сацыяльна-псіхалагічную дзейнасць, пры гэтым суб'ект-суб'ектнае ўзаемадзеянне пашыраецца да ўзаемадзеяння чалавека і грамадства [3, с. 77].

Праблема аб'ектывацыі псіхічных з'яў як унутранага свету чалавека, які заключаецца ў яго перажываннях і псіхічных вобразах, з'яўляецца ключавой у навукова-псіхалагічным пазнанні чалавека. У. М. Панфёраў адзначае, што чалавечыя адносіны выступаюць адлюстраваннем сацыяльнага ўзаемадзеяння, ажыццяўляюцца ў працэсе камунікацыі і адлюстроўваюць унутраны свет чалавека [3, с. 85].

Адной з задач пры рэалізацыі Праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і моладзі з'яўляецца выхаванне псіхалагічнай культуры, якая прадугледжвае сфарміраванасць псіхалагічнай культуры навучэнцаў, развіццё эмацыянальна-каштоўнаснай сферы асобы, павышэнне псіхалагічнай кампетэнтнасці, развіццё камунікатыўных здольнасцей навучэнцаў [4, с. 3]. Такім чынам, рэалізацыя падобных праектаў можа садзейнічаць з'яўленню ў псіхічнай арганізацыі чалавека сацыяльна-псіхічных камунікатыўных і маральных утварэнняў, якія пазней трансфармуюцца ў псіхалагічныя якасці сацыяльнага інтэлекту і характару чалавека. Паводле У. М. Панфёрава, функцыі трох узроўняў псіхічнага працэсу трансфармуюцца ў функцыі зносін (камунікатыўныя, інфармацыйныя, кагнітыўныя, эматыўныя, канатыўныя, крэатыўныя), якія знаходзяць рэалізацыю ў працэсах узаемасувязі, паведамлення, узаемапазнання, узаемаадносін, узгаднення, узаемаўплыву. Асноўным псіхалагічным зместам сацыяльнага ўзаемадзеяння з'яўляюцца чалавечыя адносіны. [3, с. 78].

У працэсе аналізу моўных сродкаў адмоўных інтэнсіўных эмоцый, пры дапамозе якіх ажыццяўляецца працэс сацыяльнага ўзаемадзеяння людзей у публіцыстычных тэкстах, намі было выяўлена выкарыстанне тэрміналогіі з галіны псіхалогіі, псіхатэрапіі і сацыяльнай педагогікі. Гэта абумоўлена сацыяльным запытам грамадства на выхаванне псіхалагічнай культуры ў моладзі, у выніку чаго назіраецца значнае павелічэнне частотнасці выкарыстання псіхалагічнай, сацыяльна-педагагічнай тэрміналогіі ў камунікацыі ў апошнія гады. Эмоцыя гневу знаходзіць вербалізацыю ў артыкулах праз выкарыстанне першасных намінацый, якія носяць тэрміналагічны характар: *Падлетак, які падвяргаецца дома фізічнаму гвалту, праяўляе* ***агрэсіўнасць*** *у дачыненні да аднагодкаў і дарослых* (Настаўніцкая газета, 07.06.2022 г.); альбо могуць быць дастаткова нейтральнымі: *Дапамагаючы дзецям выйсці з канфлікту і вызваліцца ад* ***крыўды і злосці,*** *сачыце за тым, каб яны не пераходзілі на асабістасці* (Настаўніцкая газета, 13.04.2022 г.). Як бачым, прыклады адлюстроўваюць паступовае з'яўленне ў псіхічнай арганізацыі чалавека камунікатыўных і маральных сацыяльна-псіхічных утварэнняў.

Як паказала даследаванне, у публіцыстычных тэкстах, арыентаваных на асвятленне такіх тэм, як развіццё эмацыянальна-каштоўнаснай сферы асобы, развіццё камунікатыўных здольнасцей адрасата, павышэнне псіхалагічнай кампетэнтнасці, вербальная рэалізацыя эмоцыі гневу можа быць выражана наступнымі мадэлямі першаснай намінацыі ўнутранага свету чалавека: N (назоўнік), Adj + N (прыметнік + назоўнік), Adj (прыметнік), V (дзеяслоў) (рысунак 1).




*Рысунак 1 – Вербальная рэалізацыя першасных намінацый адмоўных інтэнсіўных эмоцый*

Мадэлі N (назоўнік) і Adj+N (атрыбутыўныя прэпазіцыйныя словазлучэнні) з'яўляюцца найбольш частотнымі сродкамі выражэння першасных намінацый гневу і злосці: *Калі кагосьці аднойчы абразілі – гэта насілле, калі гэта адбываецца з кімсьці, хто не можа сябе абараніць, сістэматычна і перыядычна, – гэта* ***булінг*** (Звязда, 31.05.2022 г.); *А 18,2 % навучэнцаў старшых класаў падвяргаліся* ***кібербулінгу****, які здольны ўплываць на іх эмацыянальны і псіхалагічны стан* (Настаўніцкая газета, 07.06.2022 г.). Шырокае ўжыванне дадзеных канструкцый можа быць абумоўлена намерам адрасанта растлумачыць значэнне той ці іншай псіхалагічнай з'явы, прадставіць статыстычныя дадзеныя, што можа садзейнічаць выхаванню маральна і сацыяльна развітага будучага пакалення.

Трэцяй па колькасным паказчыку выступае структурная мадэль Adj (прыметнік): *Праблема* ***аўтадэструктыўных*** *паводзін дзяцей і падлеткаў – адна з найбольш вострых у прамым і пераносным сэнсе гэтага слова; Якой павінна быць своечасовая дапамога* ***адыктыўным*** *падлеткам?* (Настаўніцкая газета, 14.06.2022 г.); *Насамрэч* ***дэструктыўных*** *эмоцый няма. Любая можа стаць такой, калі ў ёй завіснуць* (Звязда, 01.01.2023 г.). Як было заўважана з прыкладаў, у большасці выпадкаў мадэль Adj выкарыстоўваецца адносна паняццяў, якія ўжо вядомы адрасату і з'яўляюцца агульнаўжывальнымі. Пры перадачы першасных намінацый часта выкарыстоўваюцца атрыбуты з іншамоўнымі прыстаўкамі *дэз-* і *дыс-*: *Сацыяльна* ***дэзадаптаванае*** *дзіця часта знаходзіцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі і з'яўляецца ахвярай* (Настаўніцкая газета, 14.06.2022 г.); *Такім чынам, адносіны ў няшчаснай,* ***дысфункцыянальнай*** *сям'і ўплываюць на ўсе сферы жыццядзейнасці дзіцяці* (Настаўніц-кая газета, 14.06.2022 г.). Выкарыстанне

атрыбутаў такога характару можа быць абумоўлена неабходнасцю фарміравання псіхалагічнай культуры ў сучасным грамадстве.

Мадэлі Adv (прыслоўе) і V (дзеяслоў) таксама знаходзяць вербалізацыю ў публіцыстычных артыкулах праз выкарыстанне першасных намінацый, але ў значна меншай ступені: *У любых адносінах любіце і паважайце ў першую чаргу сябе. І не давайце нікому, па-за залежнасцю ад статуту,* ***маніпуляваць*** *вамі* (Звязда, 01.01.2023 г.).

Праведзенае даследаванне паказала, што першасныя намінацыі эмоцыі гневу часта паддаюцца марфалагічнай дэрывацыі і могуць прывесці да ўтварэння неалагізмаў: ***Булеры*** *смялейшыя ў віртуальнай прасторы, бо кіруюцца ілюзорным пачуццём бяспекі і ананімнасці; Рабіць скрыншоты – як бы ні было крыўдна і прыкра захоўваць пра сябе негатыў: у будучыні, калі справа дойдзе да разбору з'явы, гэта дапаможа даказаць, што вас* ***булілі*** (Звязда, 31.05.2022 г.); *На стэндах у нашай гімназіі многа* ***антыбулінгавай*** *інфармацыі, наклеек* (Настаўніцкая газета, 07.06.2022 г.). З прыкладаў бачна, што ўтвараюцца цэлыя словаўтваральныя ланцужкі, якія сведчаць пра наяўнасць працэсаў дынамізму ў нацыянальна-моўнай карціне свету.

Як паказала даследаванне, асноўная функцыя першасных намінацый у публіцыстычных тэкстах – інфарматыўная, задачай якой з'яўляецца павышэнне псіхалагічнай кампетэнтнасці грамадства, а таксама развіццё камунікатыўных здольнасцей моладзі.

У працэсе атаясамлівання ўнутранага свету чалавека свету знешняму важную ролю адыгрывае метафара, якая характарызуецца антрапаметрычнасцю па сваёй прыродзе. Унутраны свет чалавека ўзнаўляецца па падабенстве знешняга аблічча чалавека і фізічнага свету. На думку М. В. Піменавай, да паняцця ўнутраны свет чалавека адносяцца яго псіхічныя ўласцівасці, характар, схільнасці, імкненні, стаўленне да людзей і да сябе, густы, агульная структура асобы, погляды, уяўленні, часовыя псіхічныя і эмацыйныя станы, жаданні, намеры, думкі, здольнасці, пачуцці [5, с.12–13].

Н. Д. Аруцюнава паказвае на той факт, што «паколькі ўнутраны свет чалавека мадэлюецца па ўзоры знешняга, матэрыяльнага свету, то асноўнай крыніцай псіхалагічнай лексікі з'яўляецца лексіка "фізічная", якая ўжываецца ў другасных, метафарычных значэннях» [6, с. 387].

Пры аналізе публіцыстычных тэкстаў былі заўважаны выпадкі ўжывання другасных намінацый з'яў унутранага свету чалавека: *Такія дзеці не ўмеюць кантраляваць свае пачуцці, у іх* ***эмацыянальныя арэлі****: у гэтую хвіліну ўсё добра, праз пяць хвілін усё жудасна!* (Настаўніцкая газета, 18.07.2022 г.). Адмоўныя (гнеў, ярасць, злосць) альбо змешаныя інтэнсіўныя эмоцыі і рэакцыі ў асноўным прадстаўлены фразеалагічнымі канструкцыямі, якія заснаваны на прасторавай форме ўсведамлення свету і рэчаіснасці: *Напрыклад, за* ***гневам*** *мамы ці бацькі, які* ***абвальваецца*** *на дачку ці сына і ўспрымаецца імі з велізарнай крыўдай, насамрэч можа быць шмат кахання; У мяне была кліентка, якая выпадкова выдаліла Інстаграм, і за некалькі дзён без яго вярнула сабе* ***душэўную раўнавагу****!; Многім людзям уласціва* ***завісаць на сваіх крыўдах, страхах*** (Звязда, 01.01.2023 г.). Як бачым, публіцыстычны дыскурс прадстаўлены шырокім ужываннем лакатыўных другасных намінацый пры апісанні адмоўных (гнеў, ярасць, злосць) альбо змешаных інтэнсіўных эмоцый.

Магутным метафараўтваральным патэнцыялам валодаюць лексічныя адзінкі, якія характарызуюць стыхію агню: *А калі* ***канфлікт разгараецца*** *ў офісе, гэта можа абярнуцца нервовым зрывам; Такім чынам, калегу давядзецца прыслухоўвацца і аўтаматычна зніжаць гучнасць і тым самым* ***напал гутаркі*** (Звязда, 22.01.2023 г.). Агонь уяўляецца грозным, лютым, помслівым полымем, якое пагражае смерцю і знішчэннем і адлюстроўвае інтэнсіўныя, часта непадуладныя кантролю эмоцыі і пачуцці.

Неабходна адзначыць, што ў публіцыстычных тэкстах часта сустракаецца камбінацыя першаснай і другаснай намінацый, якія ўтвараюць словазлучэнне: ***Раны прыніжэння і здзекі не гояцца гадамі, рубцы абыякавасці і ігнаравання*** *застаюцца на ўсё жыццё* (Настаўніцкая газета, 13.04.2022 г.); *Калі разумееш, што ёсць рэчы, якія нам непадуладныя,* ***градус эмацыйнай напругі*** *змяншаецца, мы пераходзім да пэўных дзеянняў; У такія моманты пачынаецца* ***ментальная жуйка****, застраванне на дэструктыўных эмоцыях* (Звязда, 01.01.2023 г.). Ужыванне канструкцый з камбінацыяй першаснай і другаснай намінацый павялічвае інтэнсіўнасць вербалізаванага пачуцця і ўзмацняе экспрэсіўнасць выказвання.

Даследаванне паказала, што ўжыванне другасных намінацый пры апісанні эмацыянальнага стану гневу ў публіцыстычным дыскурсе не з'яўляецца частай з'явай. Было заўважана, што марфалагічныя і фразеалагічныя канструкцыі ў асноўным ужываюцца ў пачатку альбо ў канцы артыкула. Прыклады паказваюць, што асноўная функцыя ўжывання другасных намінацый у публіцыстычных тэкстах – гэта выклікаць зацікаўленасць, пабудзіць адрасата прадоўжыць чытанне артыкула. Ужыванне другасных намінацый у канцы артыкула сведчыць пра намер адрасанта стварыць экспрэсіўна-ацэначную танальнасць. Метафары і фразеалагізмы ў такіх выпадках служаць моцным сродкам сэнсавага выдзялення.

Як паказала даследаванне, у публіцыстычным дыскурсе могуць ужывацца першасныя і другасныя намінацыі ўнутранага свету чалавека, якія характарызуюць адмоўныя інтэнсіўныя пачуцці. Колькасныя характарыстыкі першасных намінацый значна вышэйшыя, што звязана з сацыяльным запытам грамадства на выхаванне псіхалагічнай культуры ў моладзі. Шырокае ўжыванне такіх мадэляў, як N, Adj + N можа быць абумоўлена намерам растлумачыць значэнне той ці іншай псіхалагічнай з'явы, прадставіць статыстычныя дадзеныя, што можа садзейнічаць выхаванню маральна і сацыяльна развітага будучага пакалення. Акрамя таго, першасныя намінацыі адмоўных інтэнсіўных эмоцый актыўна паддаюцца марфалагічнай дэрывацыі і могуць прывесці да ўтварэння неалагізмаў, што сведчыць пра наяўнасць працэсаў дынамізму ў нацыянальна-моўнай карціне свету.

Публіцыстычны дыскурс прадстаўлены ўжываннем другасных намінацый пры апісанні адмоўных інтэнсіўных эмоцый, якія часцей носяць лакатыўны характар. Ужыванне канструкцый з камбінацыяй

першаснай і другаснай намінацый павялічвае інтэнсіўнасць вербалізаванага пачуцця і ўзмацняе экспрэсіўнасць выказвання.

Як паказала даследаванне, асноўная функцыя першасных намінацый у публіцыстычных тэкстах – інфарматыўная, задачай якой з'яўляецца павышэнне псіхалагічнай кампетэнтнасці грамадства, а таксама развіццё камунікатыўных здольнасцей моладзі. Другасныя намінацыі носяць экспрэсіўна-ацэначную танальнасць. Метафары і фразеалагізмы ў такіх выпадках служаць моцным сродкам сэнсавага выдзялення і ўздзеяння на чытача.

*Літаратура*


1. *Субота, К. І.* Унутраны свет чалавека праз прызму псіхалагічных і лінгвістычных даследаванняў / К. І. Субота, М. Ю. Чыкіль // Весці БДПУ. Серыя 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2021. – № 4. – С. 74–77.
2. *Shymanskaya, O.* Semantic Patterns for Anger in the Belarusian Language / O. Shymanskaya // Paradigmata Poznání. – 2022. – № 4. – P. 47–49.
3. *Панферов, В. Н*. Объективация психических явлений / В. Н. Панферов // Universum: Вестник Герценовского университета, 2014. – Вып. 2. – С. 76–87.
4. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021-2025 гг. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/images/2021/03/programma-vospitaniya-2021-2025.pdf – Дата доступа: 10.04.2023.
5. *Пименова, М. В*. Концепты внутреннего мира (русско-английские соответствия) : дис. … д-ра филол. наук: 10.02.01/ М. В. Пименова. – СПб., 2001. – 497 с.
6. *Арутюнова, Н. Д*. Язык и мир человека / Н. Д. Арутюнова. – М. : Школа «Языки русской культуры»: I–XV, 1999. – 896 с.


*References*


1. *Subota, K. I.* Unutrany svet chalaveka praz pryzmu psihalagichnyh i lingvistychnyh dasledavannyaŭ / K. I. Subota, M. Yu. Chykil' // Vesci BDPU. Seryya 1, Pedagogika. Psihalogiya. Filalogiya. – 2021. – № 4. – S. 74–77.
2. *Shymanskaya, O.* Semantic Patterns for Anger in the Belarusian Language / O. Shymanskaya // Paradigmata Poznání. – 2022. – № 4. – P. 47–49.
3. *Panferov, V. N*. Ob"ektivaciya psihicheskih yavlenij / V. N. Panferov // Universum: Vestnik Gercenovskogo universiteta, 2014. – Vyp. 2. – S. 76–87.
4. Programma nepreryvnogo vospitaniya detej i uchashchejsya molodezhi na 2021-2025 gg. [Elektronnyj resurs]. – Rezhim dostupa: https://adu.by/images/2021/03/programma-vospitaniya-2021-2025.pdf – Data dostupa: 10.04.2023.
5. *Pimenova, M. V*. Koncepty vnutrennego mira (russko-anglijskie sootvetstviya) : dis. … d-ra filol. nauk: 10.02.01/ M. V. Pimenova. – SPb., 2001. – 497 s.
6. *Arutyunova, N. D*. Yazyk i mir cheloveka / N. D. Arutyunova. – M. : Shkola «Yazyki russkoj kul'tury»: I–XV, 1999. – 896 s.